Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Зацверджана*
*Вучэбна-метадычным аб'яднаннем*
*вышэйшых навучальных устаноў*
*Рэспублікі Беларусь*
*па гуманітарнай адукацыі*
*18 студзеня 2006 г.*
*Рэгістрацыйны № ТД-ДГ.015/тып*

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕАГРАФІЯ

## ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ДЛЯ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ па спецыяльнасці 1 – 21 05 01 Беларуская філалогія

Мінск
2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Б 46

Аўтар-складальнік:
**М. Р. Прыгодзіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Р Э Ц Э Н З Е Н Т Ы :

кандыдат філалагічных навук **Д.Д. Паўлавец**, дацэнт, загадчык кафедры беларускай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны;
кафедра гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна (загадчык кафедры – кандыдат філалагічных навук дацэнт **М. М. Аляхновіч**)

**Рэкамендавана:**

Кафедрай гісторыі беларускай мовы БДУ 5 кастрычніка 2005 г. (пратакол №3),
Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта "12" кастрычніка 2005 г. (пратакол №1).

**Беларуская палеаграфія:** Вучэбная праграма для вышэйшых
Б 46 навучальных устаноў па спецыяльнасці 1 – 21 05 01 Беларуская філалогія / Склад. М.Р. Прыгодзіч. – Мн.: РІВШ БДУ, 2006 – 9 с.

© Прыгодзіч М.Р., 2006
© РІВШ БДУ, 2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская палеаграфія — гісторыка-філалагічная дысцыпліна, якая вывучае гісторыю пісьма, заканамернасці развіцця графічных форм літар, пісьмовых знакаў, шрыфтоў, а таксама помнікі старажытнага пісьменства з мэтай прачытаць іх, вызначыць аўтара, час і месца стварэння, аўтэнтычнасць тэксту і інш. Вывучэнне беларускай палеаграфіі, якая выдзелілася ў самастойную вучэбную дысцыпліну толькі ў пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя, адбываецца ў цеснай сувязі з такімі дысцыплінамі гістарычнага і лінгвістычнага напаўнення, як гісторыя беларускай літаратурнай мовы, беларуская дыялекталогія, гістарычная граматыка беларускай мовы, тэксталогія, археаграфія, дыпламатыка, сфрагістыка, геральдыка і інш.

Курс займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў, паколькі дазваляе ацаніць гістарычна-зменлівы рух пазнання чалавекам інтэлектуальнай спадчыны шматлікіх пакаленняў, вызначыць адметнасці гісторыі беларускага пісьменства, уклад беларускіх асветнікаў у сусветную скарбніцу культуры. Веданне беларускай палеаграфіі неабходна і для практычнага засваення напісанага ў старажытнасці і ў нашы дні, для выпрацоўкі навыкаў аналізу кніжных і рукапісных тэкстаў з пункту гледжання іх упрыгажэнняў, стыляў пісьма, зменлівасці графічных знакаў і інш.

Прыкладны расклад гадзін па відах навучання:

усяго — 34 гадзіны, у тым ліку 18 гадз. лекцыйных, 10 гадз. практычных заняткаў, 6 гадз. — заняткі па кантролю за самастойнай працай студэнтаў (КСР).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# У В О Д З І Н Ы

Прадмет і задачы палеаграфіі. Палеаграфія як навука аб знешніх асаблівасцях рукапіснага і друкаванага тэксту. Сувязь палеаграфіі з сумежнымі гісторыка-філалагічнымі дысцыплінамі: эпіграфікай, дыпламатыкай, нумізматыкай, сфрагістыкай, геральдыкай, крыптаграфіяй, філіграналогіяй, дысцыплінамі цыклу гісторыі мовы.

Падзел палеаграфіі ў залежнасці ад алфавіта і мовы на грэчаскую, лацінскую, арабскую, армянскую, славянскую і інш.

Славянская палеаграфія (глагалічная і кірылаўская) як навука, што вывучае старажытныя тэксты балгар, сербаў, рускіх, беларусаў, украінцаў і інш.

Беларуская палеаграфія як асобная гісторыка-філалагічная дысцыпліна.

## Палеаграфічныя даследаванні ў Еўропе і ва ўсходніх славян

Узнікненне палеаграфіі як навукі. Бернард Манфакон і яго "Грэчаская палеаграфія" (Парыж, 1708).

Першыя палеаграфічныя даследаванні ў Расіі. Палеаграфічны аналіз памора Андрэя Дзянісава ("Паморскія адказы" XVIII ст.).

Прыватныя вотчынныя архівы XVII - XVIII ст., палеаграфічныя заўвагі і каментарыі ў працах А. Аленіна, М. Ламаносава, М. Новікава, В. Тацішчава. Ліст А. Аленіна графу А. Мусіну-Пушкіну пра надпіс на Тмутараканскім камені (знойдзены ў 1792 г.). Палеаграфічныя даследаванні М. Карамзіна, Е. Ермалаева, Я. Балхавіцінава, П. Строева, К. Калайдовіча, М. Пагодзіна і інш.

Руская палеаграфія XIX — пачатку XX ст. Палеаграфічныя апісанні і выданне старажытных рукапісаў усходніх славян Ф. Буслаевым, І. Сахаравым, К. Трамонінам, І. Сразнеўскім і інш. Роля Пецярбургскага археалагічнага інстытута (адкрыты ў 1877 г.) у развіцці крыніцазнаўства і дапаможных гістарычных дысцыплін, у тым ліку і палеаграфіі.

Першыя абагульняючыя працы па ўсходнеславянскай палеаграфіі (І. Сахараў, І. Сразнеўскі, Д. Празароўскі, М. Ціханраваў, А. Сабалеўскі, І. Шляпкін і інш.).

## Беларуская палеаграфія

Дзейнасць Віленскай (1842, 1864) і Кіеўскай (1843) археаграфічных камісій як зыходная база для палеаграфічных даследаванняў беларускіх і ўкраінскіх помнікаў пісьменства.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Палеаграфічнае апісанне і выданне помнікаў старабеларускага пісьменства XIV — XVII ст. І. Даніловічам, І. Грыгаровічам, М. Доўнар-Запольскім, А. Сапуновым і інш.

Я. Карскі як беларускі і славянскі палеограф. "Славянская кірылаўская палеаграфія" (1897; другое выд. 1928) Я. Карскага і яе месца ў беларускай палеаграфіі.

Палеміка ў беларускім друку пачатку XX ст. адносна дзвюх графічных сістэм, якія існавалі на той час на Беларусі. Роля Б. Тарашкевіча ў станаўленні беларускага пісьменства і беларускай палеаграфіі ў прыватнасці.

Палеаграфічныя і крыніцазнаўчыя даследаванні беларускіх лінгвістаў і гісторыкаў XX стагоддзя (А. Антановіч, У. Анічэнка, А. Булыка, Дз. Даўгяла, Н. Вайтовіч, А. Жураўскі, У. Свяжынскі, М. Улашчык, Г. Харашкевіч і інш.).

Беларуская палеаграфія ў другой палове XX — пачатку XXI ст. Станаўленне беларускай палеаграфіі як вучэбнай дысцыпліны (1995 г., філалагічны факультэт БДУ); палеаграфічныя даследаванні І. Гапоненка, І. Клімава, В. Несцяровіча, М. Прыгодзіча, гісторыка-юрыдычныя публікацыі Я. Юхо, А. Вішнеўскага, У. Свяжынскага і інш.

Вузаўскія падручнікі і дапаможнікі, у якіх у той ці іншай меры закраналіся праблемы беларускай палеаграфіі (Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мн., 1983; А. Игнатенко, Н. Можейко. Древнерусский язык. Мн., 1978).

## Славянскае пісьмо

Гісторыя ўзнікнення першай славянскай азбукі. Глаголіца як місіянерская азбука Канстанціна (Кірылы) Філосафа. Глаголіца і кірыліца, іх асаблівасці і змяненні ў гісторыі развіцця літаратурных моў славян.

Роля стараславянскай (царкоўнаславянскай) мовы ў фарміраванні графіка-арфаграфічных традыцый ва ўсходнеславянскіх мовах. Другі паўднёваславянскі ўплыў, яго адбіццё ў графіцы і арфаграфіі ўсходнеславянскіх помнікаў пісьменства.

Рэфарматарская дзейнасць у галіне ўсходнеславянскай графікі Фр. Скарыны і І. Капіевіча, станаўленне "грамадзянскага" алфавіта.

Кірыліца і лацініца ў гісторыі беларускага пісьменства. Беларуская мова арабскімі літарамі. Кітабы як моўна-графічны фенамен у гісторыі беларускай мовы.

Узнікненне і замацаванне ў беларускай графіцы літар і графічных знакаў ў, дз, дж, ' (апостраф); гісторыя графемы, што абазначала гук г (выбуховы).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Роля першых беларускіх выдавецтваў і газет "Наша доля" і "Наша ніва" ў станаўленні нацыянальнай графіка-арфаграфічнай сістэмы.

## Матэрыялы і прылады пісьма

Матэрыялы пісьма: папірус, пергамент, папера. Асноўныя матэрыялы пісьма ў славян (папера, пергамент). Тэхналогія вырабу пергамента. Першыя папяровы "млыны" ("мельніцы") на тэрыторыі Беларусі ў часы Вялікага Княства Літоўскага.

Берасцяныя граматы. Надпісы на прадметах матэрыяльный культуры.

Асаблівасці прыгатавання і састаў чарніла ад старажытных пісцоў (расліннае чарніла, кінавар, сурык, пурпур, золата, серабро) да нашых дзён.

Прылады пісьма старажытных пісцоў і перапісчыкаў. Сучасныя прылады пісьма.

Працэс пісьма. Сістэма разліноўкі ліста паперы, памер старонак, пераплёт кніг і рукапісаў, разнавіднасці фігур цісненння на пераплётах, засцежкі. Абклад кніг і рукапісаў.

## Асаблівасці старажытнага пісьма

Дэкаратыўнае пісьмо. Вязь, руская вязь, час яе ўзнікнення і адметныя рысы.

Арнамент і яго віды. Усходнеславянскія разнавіднасці кніжнага арнаменту. Палеаграфічны аналіз мініяцюр. Застаўкі, канцоўкі, віньеткі як віды кніжнага арнаменту ў рукапісных і друкаваных помніках старабеларускага пісьменства.

Вадзяныя знакі і іх паходжанне. Вадзяныя знакі (філіграні) ў якасці палеаграфічный прыметы. Работа М. Ліхачова аб вадзяных знаках на паперы.

Стылі пісьма (почырку): устаў, паўустаў, скарапіс. Мэты і тэхнічныя прыёмы скарапісу. Асаблівасці беларускага скарапісу ў параўнанні з маскоўскім.

Элементы старажытных кніжных упрыгажэнняў у практыцы сучаснага кнігавыдання.

Дапаможнікі па вывучэнню скарапісу. Сучасныя "Пропісі" і старажытныя настаўленні па пісьму.

Тайнапіс. Мэты і асаблівасці тайнапісу. Віды сістэм тайнапісу.

Летазлічэнне. Сістэма летазлічэння ў славян, перавод і зверка дат. Суадносіны літар і лічбаў у глаголіцы і кірыліцы.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Палеаграфічныя асаблівасці старадрукаў

Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, І. Фёдарава. Францыск Скарына як рэфарматар кнігавыдавецкай справы. Шрыфт выданняў Ф. Скарыны, асаблівасці гравюр, буквіц і ініцыялаў беларускага першадрукара. Роля і месца Ф. Скарыны ў пашырэнні кнігадрукавання ва ўсходніх славян. Асноўныя цэнтры кніжнай культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім. Віленская друкарня братоў Мамонічаў як адзін з галоўных кнігавыдавецкіх цэнтраў на Беларусі. Палеаграфічныя асаблівасці "Статута ВКЛ 1588 г." і іншых выданняў братоў Мамонічаў.

Палеаграфічныя асаблівасці асобных выданняў старабеларускага перыяду ("Апокрысіс" Хр. Філалета, "Евангелле вучыцельнае" Каліста і інш.).

## Палеаграфічнае апісанне кніг і рукапісаў

Мэты і патрабаванні да апісанняў рукапісаў і кніг. Структура палеаграфічнага артыкула ў бібліяграфічных апісаннях кніг і старажытных рукапісаў. "Кніга Беларусі" як узор палеаграфічнага апісання старажытных кніг і рукапісаў.

## Асноўная літаратура

Булыка А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. Мн., 1970.

Жуковская Л. П. Текстология и язык древнейших славянских памятников. М., 1976.

Карский Е. Ф. Славянская кирилловская палеография. М., 1979.

Леонтьева Г.А. Палеография. Хронология. Археография. Геральдика. М., 2000.

Лёвочкин И. В. Основы русской палеографии. М., 2003.

Павленко Н. А. История письма. Мн., 1987.

Рейсер С. А. Палеография и текстология. М., 1970.

Тихомиров М. Н., Муравьев А. В. Русская палеография. М., 1966.

Улащик Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973.

Черепнин Л. В. Русская палеография. М., 1956.

Щепкин В. Н. Русская палеография. М., 1999.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Дадатковая літаратура


Антонович А. К. Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система. Вільнюс, 1968.

Александрыя // Укл. У. В. Анічэнка. Мн., 1962.

Батвіннік М. Азбука на ўсе часы. Мн., 2003.

Вайтовіч Н. Т. Баркалабаўскі летапіс. Мн., 1977.

Гравюры Францыска Скарыны / Укл. Л. Ц. Баразна. Мн., 1990.

Друцк летапісны. Друцкае евангелле. Мн., 2001.

Игнатенко А. П., Можейко Н.С. Древнерусский язык. Мн., 1988.

Клышка А. К. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга. Мн., 1983.

Куль-Сяльверстава С.Я. Беларуская палеаграфія. Гродна, 1996.

Медынцева А. А. Грамотность в Древней Руси. По памятникам эпиграфии X — первой половины XIII века. М., 2000.

Немировский Е. Л. Путешествие к истокам русского книгопечатания. М., 1991.

Несцяровіч В. І. Старажытныя рукапісы беларускіх татар. Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія. Віцебск, 2003.

Нікалаеў М. Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X — XVIII ст. Мн., 1993.

Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Фр. Скарыны / Укл. У. Г. Кароткі. Мн., 1991.

Прыгодзіч М. Р. "Азъ глаголю вамъ…": З гісторыі літар // Роднае слова, 2003, №№ 1 — 12; 2004, №№ 1 - 2.

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Мн., 1989.

Тураў. Тураўскае евангелле. Мн., 2004.

Черепнин Л. В. Новгородские берестяные грамоты как исторический источник. М., 1969.

Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI – XVII стагоддзяў. Мн., 1984.

Янин В. Л. Я послал тебе бересту… М., 1999.

Яскевіч А. А. Старабеларускія граматыкі. Мн., 1996.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Вучэбнае выданне

**БЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕАГРАФІЯ**

**Вучэбная праграма для вышэйшых навучальных установ**
**па спецыяльнасці 1 – 21 05 01 Беларуская філалогія**

Аўтар-складальнік:

ПРЫГОДЗІЧ Мікалай Рыгоравіч

Адказны за выпуск М.Р. Прыгодзіч

Камп'ютэрная вёрстка Г.У. Бобель

Падпісана да друку 12.02.2006. Фармат 60х84/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 0,5. Ул.-выд. арк. 0,4. Тыраж 100 экз. Заказ 35.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
ЛВ № 02330/0133359 ад 29.06.2004 г.
220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Вучэбна-метадычным аб’яднаннем
ВНУ Рэспублікі Беларусь
па гуманітарнай адукацыі
07 красавіка_ 2006 г.
Рэгістрацыйны № ТД-ДГ.022/тып

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-21 05 01
Беларуская філалогія

Мінск
“РІВШ”
2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

УДК 811.161.3’36’0(075.4)
ББК 81.2 Беи-2
Г 51

Рэкамендавана для зацвярджэння
ў якасці тыпавой

Вучэбна-метадычным саветам філалагічнага факультэта БДУ
12 кастрычніка 2005 г. (пратакол № 1);
кафедрай гісторыі беларускай мовы БДУ 11 кастрычніка 2005 г.
(пратакол № 4)

Складальнікі:

загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар *М. Р. Прыгодзіч*;
дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ, кандыдат філалагічных навук *С. М. Запрудскі*;
выкладчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ, кандыдат філалагічных навук *А. В. Губкіна*

Рэцэнзенты:

кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна *М. М. Аляхновіч*;
кафедра беларускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава

Г51 **Гісторыя** беларускага мовазнаўства: вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія / склад. : М. Р. Прыгодзіч [і інш.] . – Мінск: РІВШ, 2006. – 16 с.

**УДК 811.161.3’36’0(075.4)**
**ББК 81.2 Беи-2**

© Афармленне. ДУА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, 2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя беларускага мовазнаўства — вучэбная дысцыпліна, мэтай якой з'яўляецца даследаванне стану лінгвістычнай думкі пачынаючы ад першых упамінанняў пра мову беларускага насельніцтва да навуковых распрацовак XX - пачатку XXI ст. Вывучэнне гісторыі беларускага мовазнаўства адбываецца ў цеснай сувязі з такімі дысцыплінамі гісторыка-лінгвістычнага цыкла, як беларуская палеаграфія, гісторыя беларускай літаратурнай мовы, беларуская дыялекталогія.

Курс займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста-філолага, паколькі дазваляе з вышыні сённяшніх дасягненняў ацаніць стан вывучэння беларускай літаратурнай мовы і яе тэрытарыяльных гаворак на працягу XVII — XVIII стст., калі пачалі складвацца першыя ўяўленні аб культуры, побыце, фальклоры і мове беларусаў. Веданне гісторыі беларускага мовазнаўства неабходна для разумення шляхоў і спосабаў фарміравання беларускай нацыянальнай мовы, прагназавання яе далейшага развіцця ва ўмовах беларуска-рускага дзяржаўнага двухмоўя. Гісторыя беларускага мовазнаўства паказвае, як і ў тыя часы, што былі неспрыяльнымі для развіцця беларускай мовы, ва ўмовах адмаўлення самастойнасці беларускага народа і каштоўнасці яго мовы, перадавыя вучоныя па крупінцы збіралі і вывучалі яе факты, раскрывалі ўласцівую ёй адметнасць, сцвярджалі аб яе вялікіх патэнцыяльных магчымасцях. Старонкі гісторыі беларускага мовазнаўства поўныя яркіх прыкладаў самаахвярнага служэння яго прадстаўнікоў свайму прафесійнаму і грамадзянскаму абавязку — паглыбляць распрацоўку нацыянальнай спецыфікі беларускай мовы, дбаць аб далейшым павышэнні яе культуры і росце аўтарытэту ў грамадстве. Усё гэта сведчыць аб вялікім пазнавальным і культурна-выхаваўчым значэнні гісторыі беларускага мовазнаўства ў сістэме філалагічных дысцыплін.

Прыкладны расклад гадзін па відах навучання: усяго — 36 гадзін, у тым ліку 20 лекцыйных, 10 — практычных заняткаў, 6 гадзін — самастойная праца студэнтаў пад кантролем выкладчыка (КСР).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# УВОДЗІНЫ

Прадмет і задачы гісторыі беларускага мовазнаўства. Значэнне курса, яго сувязь з іншымі навуковымі дысцыплінамі. Змест паняцця “беларускае мовазнаўства”. Перыядызацыя гісторыі беларускага мовазнаўства. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускага мовазнаўства. Бібліяграфіі і агляды прац па беларускім мовазнаўстве.

Перадгісторыя беларускага мовазнаўства. Развіццё лінгвістычнай думкі ў антычным свеце.

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА Ў ДАКАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРЫЯД

***Развіццё граматычнай думкі ва ўсходніх славян старажытнай пары***. Тлумачэнне асобных слоў і тэрмінаў у кнігах XI — XIII стст. — Ізборніку Святаслава 1073 г., богаслужбовых кнігах тыпу Псалтыра, Апостала, Чэццяў і інш. Пераклад і тлумачэнне незразумелых слоў на палях і ў тэксце ўсходне (беларуска) славянскіх старадрукаў (Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Іван Фёдараў, Мялецій Сматрыцкі). Старажытныя лексікаграфічныя дапаможнікі (“Лексіс” Лаўрэнція Зізанія, “Лексікон славенароскі” Памвы Бярынды і інш.). Буквары, граматыкі і іншыя вучэбныя дапаможнікі (Іван Фёдараў, Спірыдон Собаль, Лаўрэнцій Зізаній, Мялецій Сматрыцкі, Іван Ужэвіч). Юрый Крыжаніч як даследчык беларускай мовы.

***Нараджэнне параўнальна-гістарычнага мовазнаўства*** (Франц Боп, Расмус Хрысціян Раск, Вільгельм Гумбальт, Йозеф Добраўскі, Павел Шафарык, Аўгуст Шлейхер, Франц Міклашыч, Ватраслаў Ягіч, Аляксандр Вастокаў, Ізмаіл Сразнеўскі і інш.).

***Вывучэнне беларускай мовы ў першай палавіне XIX ст***. Адносіны грамадскасці да беларускай мовы. Погляды К. Калайдовіча, Ф. Галатузава, П. Шпілеўскага на характар мовы беларусаў. Першыя працы аб беларускай мове (С.-Б. Ліндэ, А. Міцкевіч, К.Калайдовіч, П. Шафарык, І. Грыгаровіч). Ян Чачот як даследчык беларускай мовы. Беларускі матэрыял у шматмоўным слоўніку Ф. Шымкевіча.

***Вывучэнне беларускай мовы ў другой палавіне XIX ст***. Тагачасныя ўмовы навуковай распрацоўкі беларускай мовы. Роля К. Каліноўскага і Ф. Багушэвіча ў абуджэнні цікавасці да мовы беларускага народа. Этналінгвістычнае апісанне жыцця і побыту народа. Вывучэнне мясцовых гаворак (П. Шэйн, Е. Раманаў, М. Янчук, А. Сержпутоўскі, М. Федароўскі, М. Нікіфароўскі, С. Мікуцкі і інш). Іван Насовіч як мовазнавец, значэнне яго “Слоўніка беларускай гаворкі” для далейшага збору і сістэматызацыі

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

лексічнага багацця беларускай мовы. Вывучэнне гісторыі беларускай мовы (А. Шахматаў, У. Даль, А. Сабалеўскі, Ф. Буслаеў, П. Уладзіміраў і інш.).

***Вывучэнне беларускай мовы ў пачатку XX ст***. Распрацоўка агульных пытанняў беларускага мовазнаўства. Пытанні мовы ў працах рускіх і замежных лінгвістаў (І. Агіенка, В. Багародзіцкі, М. Карпінскі, С. Пташыцкі, А. Шахматаў і інш.). Зрухі ў вызначэнні статуса беларускай мовы, што адбываліся пад уздзеяннем грамадска-палітычных абставін.

Пытанні развіцця беларускай літаратурнай мовы, яе нармалізацыі, ролі ў грамадскім жыцці, у адраджэнні нацыянальнай культуры на старонках газет “Наша ніва”, “Наша доля”, “Гоман”, “Дзянніца”, розных перыядычных і неперыядычных выданняў. Першыя беларускія чытанкі: “Беларускі лемэнтар, або Першая навука чытання” (1906), “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (1906) Цёткі, “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” (1910) Якуба Коласа.

***Вывучэнне вусна-гутарковай мовы***. “Этнографическая карта белорусского племени” (1903) Яўхіма Карскага. Этналінгвістычныя і дыялекталагічныя распрацоўкі беларускай мовы ў пачатку XX ст. (А. Сержпутоўскі, І. Сербаў, А. Сабалеўскі, Д. Зяленін, М. Доўнар-Запольскі). “Смоленский областной словарь” (1914) Уладзіміра Дабравольскага, беларуска-польска-рускі слоўнік Язэпа Ціхінскага.

***Вывучэнне гісторыі беларускай мовы***. Працы па гісторыі ўсходніх славян, дыялекталогіі, гістарычнай фанетыцы і граматыцы А. Шахматава, С. Пташыцкага, У. Перагца.

Яўхім Карскі — заснавальнік беларускага мовазнаўства. Агульныя звесткі пра навуковую дзейнасць Я. Карскага. Працы Я. Карскага па дыялекталогіі і гісторыі беларускай мовы. “Беларусы” як энцыклапедыя беларусазнаўства.

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА З 1918 ПА 1941 гг.

Спецыфіка савецкага перыяду ў развіцці беларускай лінгвістыкі. Традыцыі і наватарства ў параўнанні з лінгвістычнай навукай папярэдніх гадоў.

Перыядызацыя гісторыі беларускага мовазнаўства 1918–1941 гг. Арганізацыйнае афармленне першых беларускіх навуковых устаноў. Беларускае навуковае таварыства (БНТ) у Вільні.

Першыя арганізацыйныя захады беларускага савецкага мовазнаўства. Стварэнне Навукова-тэрміналагічнай камісіі (люты 1921 г.) і Інстытута беларускай культуры (студзень 1922 г.).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

***Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі***. Зыходная база пры стварэнні беларускай навуковай тэрміналогіі. Першыя публікацыі Навукова-тэрміналагічнай камісіі. Пошукі канцэпцыі распрацоўкі беларускай нацыянальнай тэрміналогіі. Выданні серыі «Беларуская навуковая тэрміналогія» і іншыя тэрміналагічныя слоўнікі 20-х — пачатку 30-х гадоў.

***Стварэнне ў 1920-я гады практычных перакладных слоўнікаў***. Зыходная база пры стварэнні першых беларускіх слоўнікаў савецкага часу. “Сямімоўны слоўнік” (Лейпцыг, 1918). Лексікаграфічныя працы, падрыхтаваныя з удзелам М. Гарэцкага. Лексікаграфічная дзейнасць М. Байкова. Падрыхтоўка слоўніка жывой беларускай мовы. “Беларуска-расійскі слоўнік” 1926 г. і “Расійска-беларускі слоўнік” 1928 г. М. Байкова і С. Некрашэвіча. “Падручны беларуска-польскі слоўнік” Б. Друцкага-Падбярэскага (Вільня, 1929). “Яўрэйска-беларускі слоўнік” С. Плаўніка і Н. Рубінштэйна (1932).

***Распрацоўка фанетыкі і граматыкі***. “Беларуская граматыка для школ” Б. Тарашкевіча як зыходная база арфаграфічнага рэгулявання ў 1920-я гады. Першыя правапісныя дапаможнікі Я. Лёсіка і праца “Правапіс спрэчных дзеяслоўных форм” С. Некрашэвіча. Артыкулы Я.Лёсіка і арфаграфічная дыскусія сярэдзіны 20-х гадоў. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 г. як навуковая і палітычная падзея. Дзейнасць правапіснай камісіі Інбелкульта ў 1927 — 1929 гадах. Праект беларускага правапісу 1930 года.

Усталяванне граматычных нормаў і распрацоўка фанетыкі беларускай мовы (1920-я гады). “Беларуская граматыка для школ” як зыходная база граматычнага рэгулявання ў 1920-ыя гады. Дапаможнікі па фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісу Я. Лёсіка. Падручнік “Беларуская мова” А. Багдановіча (1927). Граматычныя дыскусіі другой паловы 20-х гадоў.

***Распрацоўка ў 20-я гады канцэпцыі фарміравання беларускай літаратурнай мовы***. Зыходная база пры стварэнні канцэпцыі беларускай літаратурнай мовы. Арыентацыя на народную мову як асноўны падыход у працэсе ўсталявання літаратурных нормаў. Працы “Некаторыя ўвагі да беларускае літаратурнае мовы” Я. Лёсіка (1924 — 1925) і “Да пытання аб укладанні слоўніка жывой беларускай мовы” С. Некрашэвіча (1925). Даклад “Пра некаторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратурнай мовы” І. Воўка-Левановіча (1929).

***Вывучэнне моўна-стылістычных асаблівасцей мастацкіх твораў.*** Назіранні над асаблівасцямі мовы мастацкіх твораў як спосаб вывучэння гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Артыкулы П. Бузука “Мова і правапіс твораў Якуба Коласа”, “Галоўныя асаблівасці мовы Ц.Гартнага”, “Мова і правапіс Ц. Гартнага”. Даследаванне Я. Лёсіка “Граматычны склад мовы Ц. Гартнага”.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

***Працы ў галіне культуры мовы***. Удзел вядучых мастакоў слова ў вырашэнні надзённых мовазнаўчых задач. Пытанні культуры мовы ў артыкулах Кузьмы Чорнага. Уладзімір Дубоўка як мовазнавец. Лінгвістычныя погляды Якуба Коласа. Мовазнаўчыя праблемы ў асвятленні часопісаў "Полымя" ("Полымя рэвалюцыі"), "Маладняк" і "Узвышша". Удзел пісьменнікаў у зацвярджэнні рэформы беларускай мовы 1933 года. Зборнік "Пісьменнік і мова". Пачатак лінгвістычнай дзейнасці Пятра Глебкі і Кандрата Крапівы.

***Дыялекталагічныя даследаванні***. Праграма вывучэння беларускіх гаворак Я. Карскага і яго падручнік "Русская диалектология" (1924). Дзейнасць у галіне беларускай дыялекталогіі П. Растаргуева. Даследаванні беларускіх гаворак С. Некрашэвіча і І. Воўка-Левановіча. "Спроба лінгвістычнае геаграфіі Беларусі" П. Бузука (1928) як адзін з першых дыялекталагічных атласаў у славістыцы. Дыялектная лексікаграфія 20-ых гадоў (М. Каспяровіч, М. Шатэрнік і інш.).

***Вывучэнне гісторыі беларускай мовы.*** Другі выпуск трэцяга тома манаграфіі Я. Карскага "Белорусы". "Лекцыі па гісторыі беларускай мовы" (1927) і іншыя працы І. Воўка-Левановіча. Даследаванне праблемы паходжання беларускай мовы. Падрыхтоўка гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Распрацоўка праблем гісторыі беларускай мовы за межамі Беларусі (Х. Станг, А. Мартэль).

***Рэфармаванне правапісу.*** Падрыхтоўка праектаў правапісу беларускай мовы ў 1932 — 1933 гадах. Рэформа беларускай мовы 1933 года. Уплыў структурных, асяроддзевых, культурных і сітуацыйных фактараў на правядзенне рэформы. Дзейнасць палітычнай правапіснай камісіі ЦК КПБ. Дэкрэт СНК БССР "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу" ад 26 жніўня 1933 года як паваротны пункт у гісторыі беларускай мовы.

***Палітычная лінгвістыка 1930-х гг.*** Пастанова ЦК КП(б)Б "Вынікі дыскусіі аб мовазнаўстве" 1930 г. Калектыўная праца "Мовазнаўства" шматтомнага выдання "Навука" на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі". Рэзалюцыя пленума ЦК і Мінскага гаркома КП(б)Б ад 12–15 сакавіка 1933 г. і яе значэнне для мовазнаўства 30-х гадоў. Зборнік "Пісьменнікі БССР аб рэформе правапісу беларускай мовы" і артыкулы зборніка "Пісьменнік і мова". Дыскусія вакол артыкула П. Глебкі "Праца над словам". Ліст сакратара ЦК КПБ П. Панамарэнкі "Аб беларускай мове, літаратуры і пісьменніках" у ЦК ВКП(б).

***Славістычныя і этымалагічныя даследаванні.*** Леў Цвяткоў як славіст. Славістычныя зацікаўленні П. Бузука і І. Воўка-Левановіча. Этымалагічныя даследаванні М. Когена.

***Развіццё мовазнаўства ў Заходняй Беларусі.*** Распрацоўкі па тэрміналогіі і лексікаграфіі. "Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік"

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

і "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" В. Ластоўскага. Мовазнаўства на старонках часопісаў "Крывіч", "Калоссе", "Шлях моладзі".

Я. Станкевіч і часопіс "Родная мова".

Лінгвістычная дзейнасць віленскага Беларускага навуковага таварыства.

***Беларускае мовазнаўства пасля 1933 года.*** "Змена вех" у моўным будаўніцтве. Працы па фанетыцы і марфалогіі сярэдзіны 30-х гадоў. "Руска-беларускі слоўнік" пад рэдакцыяй А. Александровіча. Нявыдадзены двухтомны руска-беларускі слоўнік. Правапісная дыскусія і абмеркаванне шляхоў развіцця беларускай мовы ў канцы 30-х гадоў. Граматычныя працы канца 30-х — пачатку 40-х гадоў. Ц. Ломцеў як даследчык беларускай мовы.

***Паланістыка і ідышыстыка.*** Паланістыка ў Беларусі ў 1920–1930-я гг. Ідышыстыка ў Беларусі. "Дыялекталогія ідыш" М. Вэйнгера (1929). "Моўны атлас ідыш Савецкага Саюза" Л. Віленкіна (1931).

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

### Распрацоўка правапісу і граматычных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

***Пасляваенныя акадэмічныя граматыкі і агульныя курсы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*** Пытанне аб прынцыпе беларускага правапісу. Дзейнасць арфаграфічнай камісіі на чале з Якубам Коласам (дзяржаўнае рэгуляванне правапісу і арфаграфіі, пастанова Савета Міністраў БССР "Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу" 1957 г.). "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" 1959 г. Выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове для сярэдняй і вышэйшай школы, арфаграфічных слоўнікаў (працы Л. Бурака, Я. Камароўскага, У. Куліковіча, М. Лобана, М. Судніка Л. Сямешкі і інш.). Пасляваенныя акадэмічныя граматыкі і агульныя курсы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Дзейнасць Ц. Ломцева (Белорусский язык. М., 1951; Грамматика белорусского языка. М., 1956). "Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі" П. Юргелевіча (Мн.,1974). "Беларуская мова" М. Булахава, М. Гурскага, М. Марчанкі (Мн., 1955–1958). Манаграфічныя даследаванні М. Булахава, М. Жыдовіч, А. Крывіцкага, Ю. Мацкевіч, Д. Лявончанкі, А. Наркевіча, П. Шубы і інш. Спецыяльныя і вучэбныя дапаможнікі для універсітэтаў. Даследаванне беларускай мовы ў працах замежных лінгвістаў (Н. Амельянюк, Г. Бідэра, Р.Г.А. дэ Брэя, П. Вэкслера, К. Гутшміта, Дж. Дынглі, А. Золтана, П. Дж.Мэё, Т. Рота-Жэброўскага, Л. Шнэйдэра і інш.). Дыскусіі аб беларускім правапісе ў канцы XX – пачатку XXI ст.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Распрацоўка фанетыкі і граматыкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы

***Вывучэнне фанетычных сродкаў мовы.*** Зараджэнне эксперыментальнай фанетыкі. Манаграфія А. Падлужнага і В. Чэкмана “Гукі беларускай мовы” (Мн., 1973). Калектыўная праца “Галосныя гукі беларускай мовы” (Мн., 1975). Дзейнасць Л. Выгоннай, А. Крывіцкага, А. Падлужнага, В. Чэкмана і інш. Вывучэнне прасадычных сродкаў беларускай мовы. Асвятленне пытанняў, звязаных з націскам, інтанацыяй і іншымі фанетычнымі сродкамі, у даследаваннях М. Бірылы, Л. Вардамацкага, Л. Выгоннай, Я. Івашуціч, Г. Мятлюк, В. Русак, Э. Якушава і інш. Працы польскіх лінгвістаў М. Аляхновіча, І. Савіцкай, Э. Смулковай і інш. Пытанні арфаэпіі ў працах М. Бірылы, А. Падлужнага, Ф. Янкоўскага і інш.

***Вывучэнне словаўтваральных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*** Новы ўзровень словаўтваральных даследаванняў у акадэмічных граматыках і агульных курсах сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Манаграфіі М. Васілеўскага, П. Вярхова, Т. Гнеўкі, А. Лукашанца, В. Мартынава, М. Паўленкі, М. Прыгодзіча, Л. Шакуна, П. Шубы, М. Ярмаш і інш. Стварэнне дапаможнікаў для вывучэння марфемнага складу слоў і словаўтварэння.

***Вывучэнне марфалагічнага ладу сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*** Дзейнасць М. Булахава, П. Вярхова, М. Жыдовіч, Ю. Мацкевіч, А. Наркевіча, Т. Сцяшковіч, П. Шубы і інш. Марфалагічнае апісанне часцін мовы ў параўнанні з іншымі мовамі (даследаванні У. Анічэнкі, М. Затаўканюка, І. Кісялёва, Г. Піўтарака, Д. Станішавай, А. Супруна, А. Шаранды і інш.). Апісанне асобных з’яў марфалагічнага ладу сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў манаграфіях Л. Антанюк, Я. Івашуціч, С. Кечык, А. Рудэнка і інш.

***Вывучэнне сінтаксісу сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*** Пашырэнне тэматыкі сінтаксічных даследаванняў. Даследаванне словазлучэнняў у манаграфіях Г.Арашонкавай і В. Лемцюговай, Т. Бандарэнкі, А. Міхневіча, А. Наркевіча, Л. Падгайскага, М. Яўневіча і інш. Вывучэнне сінтаксічных адзінак у працах М. Аўласевіча, Г. Базыленкі, Л. Бурака, Н. Гаўрош, З. Данільчык, Т. Рамзы. Супастаўляльна-параўнальнае апісанне сінтаксічных з’яў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў манаграфіях М. Канюшкевіч, Б. Нормана і інш. Тэарэтычныя і практычныя пытанні вывучэння сінтаксісу ў школе ў працах В. Протчанкі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Праца ў галіне лексікалогіі і лексікаграфіі, фразеалогіі і фразеаграфіі

***Стварэнне перакладных і іншых філалагічных слоўнікаў.*** Выданне акадэмічных перакладных слоўнікаў, "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" (Мн., 1977 – 1982). Ацэнка ТСБМ у перыядычным друку. Выданне і перавыданні "Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы". "Слоўнік беларускай мовы" пад рэд. М.В. Бірылы (Мн., 1987). Слоўнікі для школ (А. Баханькова, І. Гайдукевіча, П. Шубы; С. Грабчыкава; К. Кобызевай, Г. Хаткевіч; М. Шчарбун і інш.). Выданне "Слоўніка мовы "Нашай Нівы" ў 5 тамах, "Слоўніка мовы Янкі Купалы" ў 8 тамах. Стварэнне лексікаграфічных дапаможнікаў, прысвечаных праблемам паранімii і аманімii; выданне двухмоўных размоўнікаў. З'яўленне слоўнікаў эпітэтаў, сінонімаў і блізказначных слоў, частотнага слоўніка, слоўніка антонімаў, асацыятыўнага слоўніка і інш. Выданне іншых перакладных і шматмоўных слоўнікаў. Тэорыя і гісторыя лексікаграфіі ў працах М. Гуліцкага, В. Шчэрбіна і інш.

***Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі.*** Стварэнне ў 1979 г. Тэрміналагічнай камісіі пры АН БССР. Выданне "Беларускай энцыклапедыі" ў 18 тамах, пяцітомнай "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі", спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў па розных галінах навукі. Вывучэнне асаблівасцей станаўлення і развіцця тэрміналагічных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў даследаванні "Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі" (Мн., 1999), у працах В. Краснея. Даследаванне асобных тэрмінасістэм у працах Л. Антанюк, Г. Гваздовіч, І. Германовіча, М. Дабрыян, А. Лапкоўскай і інш.

***Распрацоўка лексікалогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*** Пытанні лексікалогіі ў пасляваенных граматыках і агульных курсах сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Дапаможнікі для сярэдняй школы (М. Абабуркі, В. Краснея і інш.). Выданне спецыяльных зборнікаў прац па розных пытаннях беларускай лексікалогіі. "Лексікалогія беларускай літаратурнай мовы" (Мн., 1994). Пытанні фарміравання беларускай лексікі ў манаграфіі А. Баханькова. Праблемы развіцця і ўдасканалення лексічных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў манаграфічных даследаваннях М. Булахава, М. Крукоўскага. Праблемы ўзаемаадносін беларускай і рускай лексічных сістэм у працах А. Супруна. Пытанні выкарыстання лексічных сродкаў у тэкстах мастацкай літаратуры ў працах М. Абабуркі, Г. Малажай і інш. Актуальныя пытанні і перспектывы развіцця лексікалогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

***Анамастычныя даследаванні.*** Фарміраванне на Беларусі нацыянальнай анамастычнай школы. Навукова-тэарэтычнае асвятленне праблем беларускай анамастыкі ў даследаваннях М. Бірылы,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

М. Грынблата, В. Лемцюговай і інш. Вывучэнне разрадаў тапанімічнай лексікі ў працах В. Жучкевіча, Я. Адамовіча, Г. Мезенка, А. Рогалева, В. Шура і інш. Працы польскіх даследчыкаў па тапаніміцы беларуска-польскага пагранічча. Вывучэнне антрапаніміі на матэрыяле помнікаў беларускага пісьменства. Слоўнікі Я. Рапановіча, І. Яшкіна. Выданне “Анамастычнага слоўніка твораў Якуба Коласа”. Перспектывы развіцця беларускай анамастыкі.

***Распрацоўка беларускай фразеалогіі і выданне фразеалагічных слоўнікаў.*** Фразеалагічныя слоўнікі П. Ахрыменкі і М. Буцько, В. Ліцвінкі і Л. Царанкова, С. Майхровіча, Я. Рапановіча, Р. Шкрабы і І. Шкрабы; Ф. Янкоўскага і інш. Выданне шматтомнай працы “Беларуская народная творчасць”. Дзейнасць Ф. Янкоўскага. Выданне “Слоўніка беларускай народнай фразеалогіі” Е. Мяцельскай і Я. Камароўскага, слоўнікаў устойлівых спалучэнняў Г. Юрчанкі. Фразеалагічныя слоўнікі для школьнікаў. Новыя напрамкі фразеаграфіі. Дзейнасць І. Лепешава, Г. Малажай. Стварэнне перакладных (двухмоўных) фразеалагічных слоўнікаў (І. Кісялёў; Л. Корсак і Л. Марціновіч; З. Санько і інш.). Праблемы станаўлення фразеалогіі як галіны мовазнаўства (працы А. Аксамітава, Г. Базыленкі, Ф. Янкоўскага і інш.). Беларуска-іншамоўныя сувязі ў галіне фразеалогіі ў артыкулах К. Гюлумянц. Пытанні фразеалагічнай стылістыкі і дыялектнай фразеалогіі ў манаграфіях М. Даніловіча, У. Коваля, І. Лепешава, Ф. Янкоўскага. Вывучэнне мастацкіх моўных сродкаў і праблем функцыянавання фразеалагізмаў у тэксце.

## Лінгвастылістычныя даследаванні

***Распрацоўка стылістыкі і пытанняў культуры мовы.*** Абмеркаванне пытанняў культуры мовы беларускімі пісьменнікамі (выказванні Я. Коласа, К. Крапівы, К. Чорнага і інш.). Даследаванні па пытаннях культуры мовы М. Абабуркі, Г. Арашонкавай і В. Лемцюговай, А. Каўруса, П. Сцяцко, Р. Шкрабы, У. Юрэвіча, Ф. Янкоўскага, А. Яскевіча і інш. Складванне стылістыкі як асобнай галіны беларускага мовазнаўства. Стварэнне першых вучэбных дапаможнікаў па стылістыцы беларускай мовы. Дзейнасць А. Каўруса, А. Юрэвіч, М. Цікоцкага. Культура маўлення як аб’ект вывучэння. Выданне вучэбных дапаможнікаў І. Лепешава, Т. Тамашэвіча. Праблемы лінгвістычнага аналізу тэксту ў працах І. Лепешава, Г. Малажай і інш.

***Назіранні над моўна-стылістычнымі асаблівасцямі мастацкіх твораў і іншых тэкстаў.*** Манаграфічныя даследаванні пра моватворчасць пісьменнікаў (М. Абабурка, А. Адамовіч, А. Каўрус, І. Лепешаў, В. Рагаўцоў, В. Рагойша, Т. Сцяшковіч, Т. Трыпуціна і інш.). Пашырэнне тэматыкі лінгвастылістычных даследаванняў мастацкіх тэкстаў. Актуальнасць лінгвастылістычных даследаванняў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Дыялекталагічныя даследаванні

***Вывучэнне дыялектнага ландшафту Беларусі.*** Лінгвістычная геаграфія, манаграфічнае апісанне дыялектаў, дыялектная лексікаграфія – новыя напрамкі пасляваенных дыялекталагічных даследаванняў. Стварэнне “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы”. Выданне “Лінгвістычнай геаграфіі і групоўкі беларускіх гаворак”, “Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак” у 5 тамах. Падрыхтоўка Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа. Першыя вучэбныя дапаможнікі па беларускай дыялекталогіі. Стварэнне дыялектнай хрэстаматыі “Вусная беларуская мова”. Роля праведзеных даследаванняў і новыя напрамкі развіцця дыялекталогіі.

***Вывучэнне структурных асаблівасцей дыялектаў.*** Манаграфіі, прысвечаныя дыялектнай фанетыцы (Т. Вайтовіч, Ф. Клімчук, І. Яшкін і інш.) і граматыцы (Ю. Мацкевіч, С. Прохарава, А. Чабярук і інш.). Рэгіянальная лексікалогія і лексікаграфія. Дзейнасць А. Станкевіч. Стан і перспектывы дыялекталагічных даследаванняў.

## Вывучэнне гісторыі беларускай мовы.

***Распрацоўка агульных пытанняў беларускага гістарычнага мовазнаўства. Вывучэнне гістарычнай фанетыкі і граматыкі беларускай мовы.*** Гісторыя часцін мовы ў даследаваннях лінгвістаў (манаграфіі М. Булахава, М. Жыдовіч, Д. Лявончанкі). Вывучэнне марфалагічных катэгорый (працы А. Груцы, І. Крамко, Т. Ясіньскай-Сохі і інш.). Стварэнне вучэбных дапаможнікаў па беларускай гістарычнай фанетыцы і граматыцы (А. Бірала, М. Булахаў, А. Булыка, П. Вэкслер, А. Жураўскі, Ф. Янкоўскі і інш.).

***Вывучэнне гістарычнай лексікалогіі беларускай мовы.*** Апісанне тэматычных груп старабеларускай лексікі на матэрыяле пісьмовых помнікаў (манаграфіі І. Козырава, Л. Малчанавай, К. Скурата і інш.). “Гістарычная лексікалогія беларускай мовы” (Мн., 1970). Пытанні фарміравання старабеларускай лексікі і іншамоўных уплываў у працах А. Булыкі. Выданне гістарычнага і этымалагічнага слоўнікаў беларускай мовы. Актуальныя праблемы гістарычнай лексікалогіі.

***Вывучэнне гісторыі беларускай літаратурнай мовы.*** Выданне “Хрэстаматыі па старажытнай беларускай літаратуры” А. Коршунава (Мн., 1959). Перавыданне пісьмовых помнікаў. “Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы”, складзеная У. Анічэнкам, П. Вярховым, А. Жураўскім і Я. Рамановіч. Вывучэнне мовы асобных помнікаў старажытнага пісьменства ў працах У. Анічэнкі, А. Булыкі, Н. Вайтовіч, І. Гапоненка, А. Дзядовай, І. Клімава, В. Несцяровіча, М. Новіка, Н. Перавалавай, М. Свістуновай, У. Свяжынскага і інш. Стварэнне вучэбных дапаможнікаў

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

і манаграфій па гісторыі беларускай літаратурнай мовы (А. Жураўскі, Л. Шакун, І. Крамко, А. Юрэвіч, А. Яновіч і інш.).

## Параўнальнае вывучэнне беларускай мовы

***Даследаванні ў галіне ўсходнеславянскай кампаратывістыкі.*** Апісанне беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі ў энцыклапедычных даведніках і вучэбных дапаможніках. Вывучэнне кантактаў паміж мовамі і іх вынікаў. Працы параўнальна-гістарычнага характару ў беларускім мовазнаўстве (У. Анічэнка, А. Булыка, М. Гурскі, І. Козыраў, Ц. Ломцеў і інш.). Даследаванні В. Баркоўскага, Л. Вардамацкага, П. Вярхова, А. Гіруцкага, М. Канюшкевіч, А. Манаенкавай, А. Міхневіча, Г. Цыхуна і інш.

***Параўнальнае вывучэнне беларускай мовы і іншых моў.*** Даследаванне беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі (працы У. Жураўля, С. Запрудскага, А. Кожынавай, І. Лекава, В. Маславай, Н. Мячкоўскай, Г. Пальцава, Б. Плотнікава, І. Роўды, А. Супруна, Г. Цыхуна і інш.). Параўнанне беларускай мовы з неславянскімі мовамі (працы В. Няхай і Т. Паплаўскай; В. Паўлоўскага і М. Шараметы; А. Шаранды і інш.). Перспектывы супастаўляльна-тыпалагічнага вывучэння беларускай мовы.

***Беларускае мовазнаўства пачатку XXI ст.*** Асноўныя напрамкі лінгвістычных даследаванняў. Лінгвакультуралагічныя працы беларускіх мовазнаўцаў. Сацыяльная лінгвістыка. Камп’ютэрная лінгвістыка. Працы па гісторыі беларускага мовазнаўства (Г. Кулеш, С. Запрудскі. Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941): хрэстаматыя).

## Асноўная літаратура

Беларуская мова: энцыклапедыя. Мн., 1994.

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны ўказальнік (1825 — 1965). Мн., 1967.

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1966 — 1975). Мн., 1980.

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1976 —1985). Мн., 1993.

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1986 —1991). Мн., 2004.

Булахов М. Г. Восточнославянские языковеды: биобиблиографический словарь. Т. 1- 3. Мн., 1976-1978.

Германовіч І. К. Беларускія мовазнаўцы: нарысы жыцця і навуковай дзейнасці. Мн., 1985.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941). Хрэстаматыя для студэнтаў філалагічнага факультэта ў 2-х частках / уклад. С. М. Запрудскі, Г. І. Кулеш. Мн., 2005. Ч. 1.

Гуліцкі М.Ф. Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі (XIX – пачатак XX ст.). Мн., 1978.

Жураўскі А. І., Крывіцкі А. А. Беларускае мовазнаўства ў Акадэміі навук БССР. Мн., 1979.

Прыгодзіч М. Р. Беларускае мовазнаўства. Мн., 2006.

Рагаўцоў В.І. Гісторыя мовазнаўства. Магілёў, 2005.

Тамашэвіч Т. І. Гісторыя беларускага мовазнаўства. Мн., 1991.

Шакун Л. М. Гісторыя беларускага мовазнаўства. Мн., 1995.

## Дадатковая літаратура

Античные теории языка и стиля. М.; Л., 1936.

Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964.

Булахов М. Г. Евфимий Федорович Карский: Жизнь, научная и общественная деятельность. Мн., 1981.

Виноградов В. В. История лингвистических учений. М., 1978.

История лингвистических учений: Древний мир. Л., 1980.

Запрудскі С. М. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 г. // Веснік БДУ. Сер. 4. 2004. № 3.

Запрудскі С. М. Правапісныя рэформы ў славянскіх літаратурных мовах у XX стагоддзі. Даклад на XII Міжнародным з’ездзе славістаў. Мн., 1998.

Інстытут беларускай культуры. Мн., 1993.

Кондрашов Н. А. История лингвистических учений. М., 1979.

Красней В. П. Пошукі прынцыпаў і шляхоў распрацоўкі беларускай нацыянальнай тэрміналогіі на пачатку XX ст. // Тэрміналагічны бюлетэнь. 1997. Вып. 1.

Мечковская Н. Б. Ранние восточнославянские грамматики. Мн., 1984.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мн., 1985.

Плотнікаў Б. А. Кароткая гісторыя беларускай мовы і мовазнаўства. Мн., 2002.

Працы Акадэмічнае канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Мн., 1927.

Рамановіч Я., Юрэвіч А. П. А. Бузук. Мн., 1969.

Хто ёсць хто ў сучаснай беларускай лінгвістыцы. Мн., 1997.

Цыхун Генадзь. Институт белорусской культуры (Инбелкульт) и начало белорусской славистики // Histoire de la slavistique: le role des institutions. Sous la direction de Antonia Bernard. Paris, 2003.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска …………………………………………………...... 3
Уводзіны ……………………………………………………………………… 4
Развіццё беларускага мовазнаўства ў дакастрычніцкі перыяд ……………… 4
Развіццё беларускага мовазнаўства з 1918 па 1941 гг. ………………………… 5
Развіццё беларускага мовазнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны ……. 8
Літаратура ……………………………………………………..………….… 13

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Вучэбнае выданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія

С к л а д а л ь н і к і :
**Прыгодзіч** Мікалай Рыгоравіч
**Запрудскі** Сяргей Мікалаевіч
**Губкіна** Алена Васільеўна

Адказны за выпуск *М.Р. Прыгодзіч*
Камп’ютэрная вёрстка *Н. У. Раготнер*
Карэктар *В. С. Ярмак*

Падпісана да друку 15.06.2006. Фармат 60х84/16. Папера афсетная. Гарнітура “Times”.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 1,22. Тыраж 100 экз. Зак. № 55.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”.
Ліцэнзія ЛВ №02330/0133359 ад 29.06.2004.
220001, Мінск, вул. Маскоўская, 15.